■ Беларусікі

Шляхамі Рагнеды

«Ёсць, вядома ж, здымкі дачкі ў вышыванцы, з валошкамі, з жабкамі і бусламі, у беларускім жыце і з беларускімі пісьменнікамі, — піша **Аксана СПРЫНЧАН, мама дзевяцігадовай Альжбэты Малішэўскай-Спрынчан.** — Ёсць здымкі, на якіх яна малюе ваўкалака, замкі, Каляды, іграе на цымбалах, спявае пад беларускую дуду. Прыгожыя і святочныя здымкі. Але я абрала здымак з нашага штодзённага жыцця і адначасова з сакральнай мясціны Беларусі — Лысай Гары, каля якой знаходзіцца Заслаўе. Ахвяры да Лысагорскіх камянёў прыносіла яшчэ Рагнеда. І Альжбэта працягвае гэтую традыцыю».

Шаноўныя мамы і таты, бабулі і дзядулі! Шчыра запрашаем вас прыняць удзел у конкурсе «Беларусікі». Дасылайце здымачкі вашых дзетак, унукаў, а можа, нават і праўнукаў (з невялічкім аповедам) на адрас «Звязды». Але адна ўмова — каб, зірнуўшы на фота, адразу ж можна было зразумець, што гэта беларусік. Арыгінальнасць і творчы падыход вітаюцца! Аднаго з герояў, якога мы ўбачым на здымках, чакае прыз!

■ Тата можа!

АД КАЎНЕРЫКА ДА КОНЧЫКАЎ МАНЖЭТ,

або Вучымся прасаваць мужчынскую кашулю

У маёй знаёмай муж — начальнік. Штодзень павінен насіць у офіс дзелавыя касцюмы і кашулі. Яго жонцы пашанцавала, бо ён прасуе апошнія, як правіла, сам. Хочаце аблегчыць жыццё сваёй каханай? Тады самы час асвоіць асновы прасавальнага мастацтва. А дапаможа вам у гэтым узорны муж і шматдзетны тата з Брэсцкай вобласці. Аляксандр сцвярджае, што прасаваць мужчынскія кашулі не складана. Трэба толькі ведаць вызначаную паслядоўнасць і некаторыя нюансы.

Перш чым уключыць прас

Вы справіцеся з прасаваннем максімальна якасна, калі заплануеце яго загадзя. Пераканайцеся, што ў ваш прас залітая дыстыляваная вада (але ніяк не вадаправодная, інакш у рэзервуары могуць утварыцца салявыя адкладанні і плям на рэчах падчас прасавання не пазбегнуць), — лепш за ўсё зрабіць гэта яшчэ з вечара. Калі пачняце прасаваць, вам дакладна ўжо будзе не да гэтага. Спецыяльна для тых дзён, калі часу ў абрэз, трымайце пад рукой бутэльку з распыляльнікам, напоўненую ачышчанай вадой. Простае спырскванне кашулі перад тым, як пачняце яе прасаваць, у разы палепшыць вынік.

Лепш за ўсё сушыць кашулю на вешалцы-плечыках. Чакаць поўнага высыхання не трэба! Бо пакуль яна яшчэ крыху вільготная, яе можна выпрасаваць пры мінімуме высілкаў. Калі кашуля ўжо перасохла, то за гадзіну-паўтары да прасавання абгарніце яе на некалькі хвілін вільготным ручніком. Вільгаць размяркуецца па тканіне раўнамерна, што істотна палегчыць прасаванне. Аднак гэта не адносіцца да кашуль з шоўку. Іх варта прасаваць выключна сухімі праз вільготную баваўняную тканіну (спырскванне вадой ці прасаванне праз марлю можа прывесці да з'яўлення плям).

Не спяшайцеся ўключаць прас, пакуль не вывучыце ярлычок на кашулі. Там указаны склад тканіны, а таксама рэкамендацыі ад вытворцы датычна прасавання. Гэта зойме зусім няшмат часу. Але пазбавіць вас ад імавернасці сапсаваць рэч. Раю адшкадаваць грошы на якасны прас і прасавальную дошку: гэта зробіць працэс больш прыемным і камфортным.

Паэтапная шпаргалка

КАЎНЕР

Пачынаць заўсёды варта менавіта з яго. Спачатку адпрасуйце левы (унутраны) бок, водзячы прас ад краёў да сярэдзіны. Затым прапрасуйце такім жа чынам і правы (добры) бок. Калі прасаваць ад сярэдзіны, то ў кутах узнікнуць непрыгожыя складкі. Многія памылкова завяршаюць прасаванне кашулі каўняром. Гэта няправільна, бо прапрасоўваючы каўнер, вы зноў пакамячыце спінку.

МАНЖЭТЫ

Доўгія рукавы пачынайце прасаваць з манжэт. Спачатку з левага боку, потым з правага. Прасаваць двайныя манжэты трэба так: адгарніце іх цалкам, прапрасуйце з абодвух бакоў без згібаў, складзіце і яшчэ раз прапрасуйце, роўна загладжваючы па згібе.

РУКАВЫ

Тое, што рукавы вашай кашулі будуць схаваныя пад пінжаком, калі вы прыйдзеце ў офіс, яшчэ не значыць, што іх можна папросту прапусціць.

У камплекце з некаторымі прасавальнымі дошкамі прадаецца спецыяльная дошка для прасавання рукавоў. Але можна абысціся і без яе. Акуратна складзіце рукаў папалам, каб шво размяшчалася пасярэдзіне. Адпрасуйце кожны рукаў з абодвух бакоў ад шва да краю. Стрэлак на рукавах не павінна быць. Гэта лічыцца дрэнным тонам. Значна аблегчыць працэс прасавання звычайны згорнуты ў рулон ручнік, засунуты ў рукаў.

ПЯРЭДНЯЯ ЧАСТКА

Пачніце з той «палічкі», на якой прышытыя гузікі. Раскладзіце кашулю на вузкай частцы прасавальнай дошкі і рухайцеся прасам знізу ўверх. Удзяліце асобую ўвагу прамежкам паміж гузікамі: крыху расцягваючы тканіну, праводзьце носікам праса.

СПІНКА

Спінка прасуецца з левага або з правага боку (у залежнасці ад матэрыялу). Прапрасуйце правую палову спінкі знізу ўверх, какетку, а затым левую палову. Завершыце прасаванне рухам праса ўздоўж левага шва зверху ўніз.

Дайце кашулі адвісецца на вешалцы ад 5 да 10 хвілін, каб яна цалкам высахла. Усё, можаце смела зашпільваць гузікі і выходзіць на работу. Цяпер ваша галоўная задача — не разліць на сябе каву, як гэта часта здараецца ў ранішняй спешцы.

Нюансы

✓ Спачатку прасуйце дробныя дэталі, а затым буйныя. Пачынайце з тых частак, дзе матэрыял сшыты ўдвая.

✓ Шарсцяную кашулю трэба прасаваць выключна з левага боку дастаткова вільготнай. Такім чынам, можна нават аднавіць ранейшыя памеры кашулі, калі яна села падчас мыцця.

✓ Кашулі з адлівам, вышыўкай ці рэльефным малюнкам прасуем толькі з унутранага боку, каб адліў не пацямнеў, а вышыўка і малюнак глядзеліся больш аб'ёмна.

✓ Цёмныя кашулі таксам абавязкова прасуюцца з унутранага боку, каб пазбегнуць з'яўлення непажаданага бляску.

✓ Не ўтрымлівайце прас вельмі доўга на адным і тым жа месцы і не прыціскайце яго вельмі моцна да тканіны.



Парады занатавала Наталля МАЎЧАНАВА.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПАКАШТУЙЦЕ!

Катлеты бываюць розныя

Бульбяныя з грыбамі

Спатрэбіцца: *бульба — 1 кг, шампіньёны — 300 г, цыбуля — 200 г, алей для смажання, мука — 3 ст. л., лаўровы ліст — 1 шт.*

Бульбу ачысціць, адварыць з соллю і лаўровым лістом і зрабіць пюрэ. Цыбулю нарэзаць і абсмажыць да залацістага колеру на алеі. Дадаць цыбулю да пюрэ. Грыбы здрабніць, абсмажыць і злучыць з пюрэ. Дадаць 2 лыжкі мукі, усё старанна змяшаць.

Зляпіць з атрыманай сумесі катлеткі і абкачаць у муцэ. Абсмажыць на алеі да залацістай скарынкі з двух бакоў.

Маркоўна-яблычныя

Спатрэбіцца: *морква — 5 шт., яблык — 1 шт., манныя крупы — 0,5 шклянкі, мука — 0,5 шклянкі, алей — 1 ст. л., цукар 2 ч. л., соль на смак.*

Моркву і яблык надзерці на буйной тарцы. Выкласці ў каструлю. Уліць 1/3 шклянкі вады, дадаць алей і патушыць 5—10 хвілін на слабым агні. Затым дадаць манныя крупы, цукар, соль. Добра змяшаць. Калі цеста атрымліваецца вельмі вадкім, то дадайце больш мукі.

Зрабіць катлеткі, абкачаць іх у муцэ і смажыць на добра разагрэтай патэльні, змазанай алеем.

ДРУГОЕ ЖЫЦЦЕ

Лаўка са старых крэслаў

У многіх знойдуцца такія старыя крэслы, якія развальваюцца ў літаральным сэнсе гэтага слова. Вядома, іх можна выкінуць, а можна і паспрабаваць зрабіць нешта вельмі цікавае і зручнае.

Лепш за ўсё падыдуць крэслы, якія маюць невялікія выгнутыя спінкі.

Збіраем каркас такой даўжыні, якой вам бачыцца лаўка, і замацоўваем кожны канец дзвюма шрубамі. Выкарыстоўвайце надзейную драўніну і доўгія самарэзы, таму што наша мэта — стварыць моцную і трывалую канструкцыю.

Нават пасля таго як мы зрабілі максімальна бяспечнае сядзенне, лаўка ўсё яшчэ можа быць занадта хісткай і ненадзейнай. Для таго каб вырашыць гэтую праблему ствараем дадатковы элемент трываласці — ніжнюю паліцу.

Запаўняем усе дзіркі ў драўніне спецыяльнай шпаклёўкай, даём час добра высахнуць, а потым старанна зачышчаем наждачкай усе паверхні, афарбоўваем любой прыдатнай фарбай.

Адразаем кавалак тоўстай фанеры неабходнага памеру.

Пакрываем фанеру вацінам ці паралонам (яго памер павінен быць крыху большы, чым у фанернага ліста) і абцягваем сядзенне абівачнай тканінай.

На гэтым этапе будзе незаменны мэблевы пісталет-стэплер.

Застаецца толькі вырашыць, пакінуць усё як ёсць ці дадаць парачку падушак.

У СЯМЕЙНЫМ ЖЫЦЦІ КУДЫ ЛЯГЧЭЙ УХІЛІЦЦА АД КАТАСТРОФ, ЧЫМ АД ПРЫКРЫХ ДРОБЯЗЯЎ (Габрыэль Гарсія Маркес).

Адказная за выпуск Надзея ДРЫНДРОЖЫК.